«воспитанность» будут использованы в разработке программного сопровождения процессов изучения, мониторинга и оптимизации воспитания и воспитанности в современной педагогике и теории культуры и деятельности.


**Литература:**

1. Брыкова, А.Л. Оценка уровня воспитанности учащихся [Текст] / А.Л. Брыкова // Постулат. 2019. № 9 (47). С. 23.
2. Давыдова, Н.Е. Изучение уровня воспитанности обучающихся как условие совершенствования процесса воспитания [Текст] / Н.Е. Давыдова // Аллея науки. 2018. Т. 1. № 1 (17). С. 467-470.
3. Кучерова, А.А. Педагогические условия формирования нравственной воспитанности старшеклассников в образовательной средней школы [Текст] / А.А. Кучерова // Kant. 2017. № 4 (25). С. 66-69.
4. Кучерова, А.А. Составляющие нравственной воспитанности старшеклассников средней школы [Текст] / А.А. Кучерова // Проблемы современного педагогического образования. 2017. № 57-11. С. 30-36.
5. Мокаева, М.А. Психическое здоровье и уровень воспитанности детей [Текст] / М.А. Мокаева // Воспитание школьников. 2019.№7.С.72-75.
6. Федосеева, Л.А. Критерии воспитанности [Текст] / Л.А. Федосеева // Гуманитарные научные исследования. 2020. № 1 (101). С. 20.
7. Чернова, Т.В. Формирование духовно-нравственной воспитанности школьников в поликультурной среде [Текст] / Чернова Т.В. // Вестник Чувашского государственного педагогического университета им. И.Я. Яковлева. 2019. № 5 (105). С. 227-234.


## НАМІНАЦЫЯ НЯПЭЎНАЙ КОЛЬКАСЦІ Ў МОВЕ ТВОРАЎ ВАСІЛЯ БЫКАВА


***Рахоўская У.А.***

*вучаніца 10 "А" класа ДУА "Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва",*

*г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік – Лузінава Л.У., настаўнік беларускай мовы і літаратуры


Моўныя сродкі намінацыі няпэўнай колькасці ў сучаснай беларускай літаратурнай мове – праблема, якая яшчэ не атрымала належнай распрацоўкі. Аналіз адпаведных навуковых лінгвістычных крыніц сведчыць пра тое, што да гэтага часу лічэбнік у беларускім мовазнаўстве з'яўляецца малавывучанай часцінай мовы. Даўно патрабуюць больш шырокага лінгвістычнага аналізу словы, якія абазначаюць няпэўную колькасць. Існуе шмат спосабаў выражэння няпэўнай колькасці, але яны пакуль што не разглядаліся ў нашым мовазнаўстве як сістэма. На сучасным этапе развіцця беларускай мовы катэгорыя няпэўнай колькасці налічвае надзвычай вялікую колькасць слоў і спалучэнняў, якія ўвесь час папаўняюцца новымі намінацыямі. Папаўненне катэгорыі няпэўнай колькасці слоў адбываецца за кошт некаторых строга акрэсленых семантычных груп. Няпэўная колькасць у адрозненне ад пэўнай колькасці знайшла сваё выражэнне ў мове твораў В.Быкава не толькі праз няпэўнакалькасныя словы, але і 1) праз колькасныя лічэбнікі са зменай парадку слоў **(***гадоў пяць, сталоў восем***)**, 2) праз назоўнікі, якія маюць значэнне няпэўнага ліку (*мноства, процьма, гурт*), 3) займеннікі, якія выражаюць няпэўную колькасць (*столькі, колькі, гэтулькі*), 4) праз прыслоўі тыпу *многа (больш), мала (менш), шмат*, 5) розныя ўстойлівыя словазлучэнні (*кот наплакаў, канца-краю няма*), 6) сінтаксічныя словазлучэнні і канструкцыі са спалучэннямі тыпу *больш за*, *больш чым, менш чым* і іншыя, 7) праз пэўнакалькасныя лічэбнікі, калі яны знаходзяцца ў своеасаблівым кантэксце (*сотні тысяч кіламетраў* нялёгкіх дарог; *не раз, не два* хадзіў ён на балота; *мільёны людзей* і інш.).

Яскравым спосабам выражэння няпэўнай колькасці ў мове твораў В. Быкава з'яўляецца метафарызацыя. У залежнасці ад агульнага лексічнага значэння галоўнага кампанента генітыўных канструкцый адрозніваюцца словазлучэнні, якія выражаюць вялікую колькасць, празмернае мноства: *мора кветак, мора слёз, безліч пнёў* і інш.; словазлучэнні, якія выражаюць малую колькасць: *жменька байцоў, кучка ягад, чародка вераб'ёў* і інш.



Репозиторий ВГУ

Выкарыстоўвае В. Быкаў і субстантыўныя канструкцыі, у склад якіх уваходзяць назоўнікі з колькасна-іменным значэннем: *сотня, тысяча, мільён, гадзіна, паўгадзіны.* У структуры намінатыўнага значэння кожнага з іх утрымліваецца кампанент значэння "пэўны лік" (пэўная колькасць) ці "няпэўная колькасць", які і складае семантычную аснову для развіцця метафарычнага колькаснага значэння, а таксама абумоўлівае іх спалучальныя магчымасці. Найбольш шырока ўжываюцца назоўнікі *сотня, тысяча*. Яны ўтвараюць словазлучэнні з назоўнікамі, якія абазначаюць адзінкі вымярэння (*тысячы год, за сотні кіламетраў, за тысячу вёрст*), асобу чалавека (*тысячам тысяч нашых бабулек, сотні тысяч людзей*), канкрэтныя прадметы (*сотні сталёвых асколкаў, сотні гэтых чаму*), абстрактныя паняцці (*тысячу талентаў, тысячу халер на іх галаву*).

У творах В. Быкава ўжываецца вялікая колькасць устойлівых выразаў, якія адлюстроўваюць нацыянальную самабытнасць і спецыфіку мовы. Пераважная большасць устойлівых адзінак мае агульнанародны характар. Тут існуе вялікая колькасць непадзельных устойлівых словазлучэнняў, якія выражаюць няпэўную колькасць. Гэта ўстойлівыя выразы тыпу *кот наплакаў, канца-краю не відаць, непачаты край* і іншыя. Устойлівыя выразы ўжываюцца пераважна ў пераносным сэнсе з абазначэннем няпэўнай колькасці ( *І звесткі кароткія, бы* ***зайцаў хвост***.)

Усе разгледжаныя ўстойлівыя словазлучэнні можна падзяліць на два разрады: словазлучэнні, якія ўказваюць на няпэўную колькасць у вялікім маштабе (*па вушы, непачаты край, да гібелі*) і словазлучэнні, якія ўказваюць на няпэўную колькасць у малым маштабе (*на раз языком лізнуць, на адзін зуб, свет з аўчынку* ).

Прадуктыўным спосабам выражэння няпэўнай колькасці ў мове аналізуемых твораў з'яўляецца марфолага-сінтаксічны спосаб. У яго склад уваходзіць вялікае мноства слоў і словазлучэнняў са значэннем няпэўнай колькасці. Да іх адносяцца ў першую чаргу словы *многа (нямнога), мала (нямала), шмат, трохі, некалькі, колькі, столькі, гэтулькі* і інш. Нягледзячы на тое, што гэтыя словы выражаюць колькасныя паняцці, значэнне пэўнага ліку яны не маюць. Сродкамі выражэння няпэўнай колькасці ў творах В. Быкава з'яўляюцца: 1) няпэўнаколькасныя лічэбнікі **(*гэтулькі*** *радасці****, столькі*** *адчаю****, колькі*** *гадоў****, некалькі*** *галасоў,* ***шмат*** *загадак,* ***троху*** *часу*); 2) спалучэнні слоў, якія сваёй семантыкай указваюць на няпэўную колькасць (*група камандзіраў, натоўп людзей, добрая палова дэталяў, большая частка гукаў*); 3) прыслоўі са значэннем няпэўнай колькасці (*вельмі многа, занадта многа, дужа ўжо шмат, даволі-такі многа, залішне шмат, чутачку, трошачкі, крышачку*); 4) часціцы *амаль, бадай, ледзь (ледзьве)* **(*амаль год, бадай што*** *паўтузіна ордэнаў****, ледзьве*** *не ў рост);* 5) парадак слоў як спосаб выражэння няпэўнай колькасці (*чалавек шэсць, гадоў восем, секунд пяць, секунд некалькі*); 6) свабодныя сінтаксічныя словазлучэнні, у якіх адносіны недакладнай, прыблізнай колькасці перадаюцца з дапамогай прыназоўнікаў ***з, са, блізка, каля, ля*** **(*блізка кіламетра, каля трох крокаў, праз які кіламетр ці болей, са два тыдні, з хвіліну*).**

Такім чынам, сродкі, якія выкарыстоўвае В. Быкаў для намінацыі няпэўнай колькасці заўсёды яркія, дакладныя і эмацыянальныя, напоўненыя глыбокім зместам.

Практычная значнасць дадзенага даследавання заключаецца ў тым, што вынікі яго будуць садзейнічаць больш глыбокаму і ўсебаковаму вывучэнню моўных сродкаў намінацыі няпэўнай колькасці.

**Літаратура:**

1. Булыка, А.М. Гістарычная марфалогія беларускай мовы. / А.М. Булыка, А.І. Жураўскі, І.І. Крамко. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 312 с.

2. Быкаў В. Збор твораў: У 6т./ Ввсіль Быкаў. – Мінск: Маст. літ., 2009

3. Вярхоў П.В. Лічэбнік у беларускай мове: Параўнальна з рускай і украінскай мовамі / В.П. Вярхоў.- Мінск : Выд-ва БДУ, 1961. – 125 с.



Репозиторий ВГУ

4. Граматыка беларускай мовы. У 2 т. / Рэдактары К.К. Атраховіч (Крапіва), М.Г. Булахаў, П.П. Шуба. Мінск: Навука і тэхніка. Т. I. Марфалогія, 1962, -680 с.; Т. II. Сінтаксіс, 1966. – 756 с.
5. Лазарук, М.А., Ленсу А.Я. Уводзіны ў літаратуразнаўства: Вучэб. дапам. / М.А. Лазарук, А.Я. Ленсу. 2-е выд. – Мінск:Вышэйшая школа,1982. – 276 с.
6. Міхневіч А.Я. Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў беларускай мове. – Мн.: Навука і тэхніка, 1965. – 112 с.
7. Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія /Пад рэд. Ф.Я. Янкоўскага. – Мн.: Выш. школа, 1980. – 240 с.

## ИССЛЕДОВАНИЕ СИЛЫ ТРЕНИЯ ПОКОЯ, ДЕЙСТВУЮЩЕЙ МЕЖДУ ВИТКАМИ НИТИ И ОПОРОЙ

***Скатова П.А.***
*учащаяся 8 класса ГУО «Средняя школа № 17 г. Витебска»,*
*г. Витебск, Республика Беларусь*
Научный руководитель – Давыдова Т.М., учитель физики

Сила трения покоя возникает при наличии внешней силы, стремящейся вызвать движение тела. Эту силу необходимо преодолеть для того, чтобы привести два контактирующих тела в движение друг относительно друга [3].

Трение покоя удерживает болты и гайки, вбитые гвозди, мешает самопроизвольно развязываться узлам [1].

Каждый из нас практически ежедневно что-нибудь завязывает: шнурки, шарф, платок, бантик. А ведь любой узел по существу представляет собой веревку, намотанную на опору (опорой в данном случае является та же самая верёвка) [2].

**Цель:** исследование зависимости силы трения покоя, действующей между витками нити и опорой от числа витков и материала опоры.

**Задачи исследования:**

• изучить и проанализировать литературу по теме исследования;

• определить выигрыш в силе, получаемый для различного числа витков для опор из разных материалов;

• установить характер зависимости силы трения покоя от количества оборотов нити и от вещества, из которого изготовлена опора.

**Материалы и методы.** Для проведения эксперимента использовались штатив, стеклянная и деревянная палочки, динамометр, груз массой 1 кг, нить.

Определена сила, необходимая для удержания нити с грузом при условии, что нить ещё не навита на опору. Также измерена минимальная удерживающая сила при различных значениях числа витков вокруг стеклянной и деревянной палочек.

Полученным данным дана табличная и графическая интерпретация.

**Результаты и их обсуждение.** Полученные результаты показали, что с ростом количества витков уменьшается значение силы, достаточной для удержания нити на опоре. Причём выигрыш в силе изменялся лавинообразно: сначала медленно, а потом происходил резкий рост. Так при 2,5 витках нити вокруг стеклянной палочки выигрыш в силе равен 5, а при 4,5 витках он уже равен 100!

А поскольку удерживать нить на опоре помогала сила трения покоя, то рост этой силы  также имел лавинообразный характер.

На величину трения влиял и материал опоры. Для деревянной палочки, которая более шероховатая по сравнению со стеклянной, получился больший выигрыш в силе при том же количестве витков.

**Заключение.** Установлено, что с увеличением числа витков нити происходит лавинообразный рост силы трения покоя. Вследствие этого минимальная удерживающая сила

Репозиторий ВГУ